# КУЛЬТУРА

Ірына СВІРКО
isvirko@mail.ru



АПЛАДЫСМЕНТЫ



*На сцэне — «Хвілінка».*

# ДЗЯЦІНСТВА ЯРКІЯ ХВІЛІНКІ

**Удзельнікі Творчай майстэрні і Шоу-тэатра «Хвілінка» Таццяны Пановай — артысты юныя, але ўжо вядомыя. За 22 гады, што існуе калектыў, паспелі не раз гучна заявіць пра сябе са сцэны. Спяваюць, танцуюць, ствараюць адмысловыя яркія музычныя спектаклі і канцэртныя праграмы, якія немагчыма не заўважыць.**

І — заўважаюць. Невыпадкова ж запрашаюць выступіць «Хвілінку» на многіх значных культурных мерапрыемствах. Яны — неаднаразовыя ўдзельнікі галоўнай навагодняй ёлкі краіны, канцэртаў стыпендыятаў Спецыяльнага фонду Прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі, фестывалю беларускай песні і паэзіі ў Маладзечне, канцэртаў у гонар Дня Незалежнасці і Дня Перамогі. Ім апладзіравалі госці нядаўняга чэмпіянату свету па хакеі, іх ведаюць гледачы Маладзёжнага тэатра эстрады, у рэпертуары якога ёсць нават спецыяльна пастаўлены для «Хвілінкі» мюзікл. З конкурснымі перамогамі і лаўрэацкімі званнямі не раз вярталіся артысты з Украіны, Расіі, Балгарыі, Польшчы, Македоніі, Чэхіі.

Кола прыхільнікаў калектыву пашыраецца з года ў год. Яго стваральнік і нязменны мастацкі кіраўнік Таццяна Панова не хавае: прыемна, што ўдаецца ажыццяўляць некалі задуманае. І дадае: поспех у педагагічнай дзейнасці немагчымы без зацікаўленага творчага тандэма вучняў і настаўніка. Гаворыць: мае поспехі — гэта перш за ўсё поспехі маіх дзяцей. Свае для яе — уся «Хвілінка».

Сабраць эстрадны дзіцячы калектыў яна марыла адразу, як пасля заканчэння музвучылішча і Універсітэта культуры і мастацтваў маладым спецыялістам прыйшла працаваць у школу гарадскога пасёлка Сокал недалёка ад Мінска. Менавіта там і нарадзіўся ансамбль «Хвілінка», які пазней перабраўся ў Палац культуры МАЗа, стаў вядомым тэатрам эстраднай песні, а пасля — Творчай майстэрняй эстраднага мастацтва «Хвілінка». Дарэчы, зараз калектыў асвойваецца ў новых сценах — у мінскай гімназіі № 75. Цікава, што кіруе ёй Васіль Ананька, менавіта ён быў тым дырэктарам школы ў Сокале, які некалі падтрымаў ініцыятыву апантанай творчасцю маладой настаўніцы стварыць дзіцячы эстрадны вакальны ансамбль. І вось — творчае сяброўства працягваецца.



*Кацярына ШУМСКАЯ.*

Зараз у асноўным складзе «Хвілінкі» звыш 30 артыстаў ад 6 да 20 гадоў. Таццяна Панова ганарыцца, што не пакідаюць калектыў тыя, хто займаецца ў ім па 10—15 гадоў. Многім «Хвілінка» дала пуцёўку ў творчую прафесію. З іх ліку, напрыклад, Кацярына Шумская, лаўрэат многіх міжнародных конкурсаў, уладальніца Гран-пры рэспубліканскага конкурсу «Белазаўскі акорд» і першай прэміі леташняга нацыянальнага конкурсу маладых выканаўцаў эстраднай песні ў Маладзечне. Дзяўчыне зараз 19, яна студэнтка Універсітэта культуры і мастацтваў, але па-ранейшаму застаецца салісткай-вакалісткай калектыву. У тым жа ўніверсітэце вучыцца Ганна Сямёнава. Сёлета яна стала рэпетытарам у падрыхтоўчай групе «Хвілінкі», працуе з пачаткоўцамі, але і сама танцаваць у Шоу-тэатры працягвае.

Як тут гавораць, «Хвілінка» — гэта сям'я і лад жыцця, ад якіх вельмі не хочацца адмаўляцца. Таму і на рэпетыцыі сюды і старэйшыя, і малодшыя не ідуць, а бягуць. Бо тут не толькі вучаць вакалу, харэаграфіі, акцёрскаму майстэрству. Тут мараць і сябруюць, разам прыдумляюць канцэртныя нумары, малююць сцэнічныя касцюмы. Абмяркоўваюць праведзеныя майстар-класы с Аляксандрам Рыбаком, Анастасіяй Валачковай ці Русланам Аляхно, сумесныя выступленні з Пятром Елфімавым, Інай Афанасьевай, успамінаюць сустрэчы з кампазітарамі Эдуардам Зарыцкім, Валерыем Івановым, Алегам Елісеенкавым і з задавальненнем развучваюць падораныя імі новыя песні. Тут цікава і па-сямейнаму цёпла.



Фота Аляксандра РУЖАЧКА

**Дарэчы, «Хвілінкай» калектыў Таццяна Панова ў свой час назвала не выпадкова. Гаворыць, хацела, каб ад яго дзейнасці хвілінкі радасці і шчасця атрымлівалі ўсе — і самі дзеці, і іх бацькі, і настаўнікі, і гледачы, якія прыходзяць на канцэрты. Яна абсалютна ўпэўнена: яркае дзяцінства абавязкова перарасце ў цікавае юнацтва, а час, праведзены з такімі хвілінкамі радасці, з прыемнасцю будзе ўспамінацца і ў дарослым жыцці.**

Вось і зараз, працягваючы накопліваць такія творчыя сонечныя хвілінкі, юныя артысты не спяшаюцца разыходзіцца на канікулы. Плануюць будучы канцэртны сезон, сумесны канцэрт з даўнімі сябрамі «Хвілінкі» — заслужаным артыстам Беларусі спеваком Уладзімірам Правалінскім і народным артыстам краіны кампазітарам Эдуардам Зарыцкім, развучваюць нумары да традыцыйнай восеньскай акцыі «Дарога дабрыні» — гэта асобная дабрачынная старонка ў творчай дзейнасці «Хвілінкі», да якой тут ставяцца з асаблівымі пачуццямі і дарослыя, і дзеці, рыхтуюць спецыяльную праграму выступлення, закупляюць разам падарункі.

А ў бліжэйшы час «Хвілінка» адправіцца на фестываль «Музычныя вечары ў Мірскім замку». Артысты Шоу-тэатра запрошаны 13 чэрвеня прыняць удзел у сольным канцэрце вядомай спявачкі Алёны Ланской. Рэпеціруюць. Хвалююцца.

Дарэчы, калі вы яшчэ не знаёмыя з удзельнікамі «Хвілінкі», пазнаць іх на сцэне вельмі проста. Любімая прычоска дзяўчынак — касічкі, упрыгожаныя белымі «крабікамі». Прыдуманая больш за 20 гадоў таму «фішка» засталася дасюль, і нават старэйшыя ўдзельніцы калектыву пры нагодзе ад яе не адмаўляюцца. «Вунь тыя «беленькія» на сцэне — гэта «Хвілінкі», — адразу заўважаюць гледачы.

**Дополнения к годовому отчету эмитента ценных бумаг ОАО «Электроаппаратура» за 2014 год**

| Кол-во акционеров | Всего | 6938 | В том числе | Юридических лиц | 3 | Физических лиц | 6935 |
|---|---|---|---|---|---|---|---|

Доля государства в уставном фонде эмитента (всего в %) - 62,7172

Информация о дивидендах и акциях

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | Миллионов рублей | 200,271 | 395,358 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | Рублей | 37,0 | 72,0 |
| Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию (включая налоги) | Рублей | 68 | 61 |
| Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде | Миллионов рублей | 354,0 | 332,0 |
| Обеспеченность акции имуществом общества | Тысяч рублей | 36,438 | 36,473 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе общества | Штук | 0 | 0 |
| Основные виды продукции или виды деятельности, по которым получено двадцать и более процентов выручки от реализации товаров, продукции, работ, услуг | | Производство бытовых электрических машин и приборов - 30,82%. Производство бытовых газовых плит - 33,71%. Производство электрораспределительной и регулирующей аппаратуры - 33,40% | |
| Обществом используется следующее Положение | | «Регламент работы с реестром владельцев ценных бумаг» | |

ВЕСТКІ

## З ЦЯГНІКА НА КАНЦЭРТ

***У час «Славянскага базару» Мінск і Віцебск злучыць дадатковы састаў — цягнік № 644/643 міжрэгіянальных ліній будзе курсіраваць паміж гарадамі з 7 па 15 ліпеня. Яго штодзённае адпраўленне са станцыі Мінск-Пасажырскі запланавана на 12.48. На канцавы прыпынак пасажыры прыбудуць у 16.25 і з лёгкасцю трапяць на любы вячэрні канцэрт. А пасля выступленняў любімых артыстаў гэтым жа цягніком у 1.40 адправяцца назад: у Мінску яны будуць у 05.28 раніцы і акурат паспеюць на працу.***

**Аддзел навін «Р»**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУ